В этот период зарождается и идея «краёвасці», которая, как считают, явилась фундаментом для дальнейшего развития белорусской национальной идеи. Основной целью «краёвасці» был поиск компромисса между практическими интересами местных этнических групп и их объединением в рамках общей Родины — исторической Литвы (на основе ВКЛ). Основным критерием принадлежности к общей нации было «адчуванне сябе грамадзянінам Краю». Эта идея активно распространялась и среди культурных деятелей, и среди простого народа. Хоть «краёвая» идея и потерпела неудачу, нельзя не признать, что она в значительной мере способствовала поиску межнационального согласия, особенно в качестве противоположности агрессивному национализму. Пройдя трудный путь от осознания себя отдельной нацией до зарождения национального движения, белорусы добились независимости для собственной страны.

На сегодняшний день проблема национального самосознания белорусов не потеряла своей актуальности. Белорусы в любом случае должны помнить о том, что у них есть собственная культура. Да, она долгое время находилась под влиянием других культур. Хорошо это или плохо — отдельный вопрос. Чувство национального самосознания — важнейший фактор при определении дальнейшего пути развития, как отдельного человека, так и государства в целом. В настоящее время, даже в условиях глобализации, нашей стране нужно сохранять самобытность и самостоятельность в выборе дальнейшего направления развития.

***С. А. Ламачэнка***
*БДЭУ*

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАЗІЦЫЯ СТУДЭНТАЎ БАБРУЙСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ТЭХНІКУМА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ІХ АСАБІСТЫХ АНКЕТ)

Грамадзянская пазіцыя — гэта якасць асобы, якая ўключае ў сябе веды, каштоўнасці, маральныя пазіцыі асобы і адлюстроўвае яе адносіны да сваёй краіны, дзяржавы, грамадзянскай супольнасці і да самой сябе. Такая пазіцыя абумоўлівае свядомыя рэальныя ўчынкі асабістага і грамадскага плана.

Грамадзянская пазіцыя маладога пакалення мае вялікую актуальнасць для кожнага грамадства на ўсіх этапах яго гістарычнага развіцця. Напрыклад, у гісторыі Беларусі такая пазіцыя мела асаблівае значэнне ў 20-я гг. XX ст., калі адбывалася станаўленне і ўмацаванне новага палітычнага рэжыму, які ўзнік пасля рэвалюцыйных падзей у кастрычніку 1917 г.

Для даследавання настрояў беларускай моладзі таго перыяду цікавай крыніцай з'яўляюцца асабістыя анкеты студэнтаў Бабруйскага педагагічнага тэхнікума, які працаваў ў 1921–1924 гг. [1]. Намі было вывучана 15 анкет студэнтаў, якія захоўваюцца ў фондах Бабруйскага занальнага дзяржаўнага архіва. Адказы на

пытанні давалі студэнты старэйшых курсаў — трэцяга і чацвёртага. Датаваны анкеты канцом студзеня — пачаткам лютага 1923 г.

Анкета утрымлівала 17 пытанняў, пачынаючы ад сацыяльнага паходжання і завяршаючы палітычнымі поглядамі рэспандэнта. Студэнты Бабруйскага педтэхнікума на пытанні анкеты адказвалі па-рознаму: адны давалі падрабязныя адказы, іншыя абмяжоўваліся фармальнымі.

Для раскрыцця тэмы нашага даследавання, зразумела, найбольшую цікавасць уяўляюць адказы на апошняе пытанне. Бабруйскія студэнты свае палітычныя погляды выказвалі вельмі асцярожна. Толькі 5 з 15 адназначна выказаліся ў падтрымку савецкай улады і камуністычнай партыі. Астатнія проста казалі пра свае сімпатыі да новай улады ці пра адсутнасць выразных палітычных поглядаў, спасылаючыся на занятасць і цяжкасці з успрыманнем палітыкі як складанай сацыяльнай з'явы. Відаць, найбольш «дысідэнцкім» адказам на апошняе пытанне анкеты быў такі: «Спачуваю некаторым ідэям бальшавікоў» [1, арк. 5].

Большасць рэспандэнтаў на пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці назвалі сябе беларусамі, некаторыя — рускімі. Былі, праўда, і такія адказы: «праваслаўны» [1, арк. 52], «селянін» [1, арк. 83], «хрысціянін» [1, арк. 121]. У гэтых адказах рэльефна выявіліся складанасці фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Пра арганізацыю педагагічнай працы ў тэхнікуме і ўвогуле ў сістэме адукацыі БССР студэнты выказваліся дастаткова крытычна, падкрэсліваючы, што гэта «самая высакародная і карысная праца, але няўдзячная» [1, арк. 5].

Такім чынам, анкеты студэнтаў Бабруйскага педагагічнага тэхнікума з'яўляюцца цікавай крыніцай, якая падае шмат разнастайнай інфармацыі аб грамадзянскай пазіцыі беларускай студэнцкай моладзі 1920-х гг.

Літаратура

1. Бабруйскі занальны дзяржаўны архіў. — Ф. 872. Воп. 1. Спр. 3.